**РЭЛІГІЙНЫ ФАКТАР У РАЗВІЦЦІ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НА БЕЛАРУСІ: ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ**

М.М. Шчэрбін
УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна"

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне як сацыякультурная з'ява развіваецца ў прасторы і часе па меры развіцця грамадства. Амаль усе яго складовыя кампаненты і структурныя, і сутнасныя, і функцыянальныя, акрамя таго, што маюць пэўны ўнутраны імпульс руху, падвяргаюцца таксама ўплыву знешніх фактараў. Дадзеныя фактары ўяўляюць сабой сукупнасць (комплекс) гісторыка-культурных умоў, якія стымулююць, актывізуюць або, наадварот, запавольваюць ці тармозяць развіццё выхаваўчага працэсу, вызначаюць агульныя тэндэнцыі і накірункі яго станаўлення.

У сувязі з гэтым развіццё грамадзянска-патрыятычнага выхавання на працягу XIV – XVII стст. у значнай ступені з'яўляецца адлюстраваннем развіцця агульнагістарычных працэсаў. Менавіта гэтыя працэсы вызначалі з аднаго боку, асноўныя накірункі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі эпохі, з другога, – патрабаванні да выхавання чалавека як да прадстаўніка пэўнага сацыякультурнага асяроддзя. Як справядліва падкрэслівае Гаўрылавец К. В., "выхаванне ўстойлівых маральных адносін да людзей, да працы, і да Радзімы ў тым ліку," адбываецца ў цеснай сувязі з адпаведным асяроддзем, дзякуючы магчымасці ўспрымаць і крытычна ацэньваць розныя грані яго быцця [2, с. 56].

XIV – XVII стст. ахопліваюць супярэчлівы час Сярэднявечча, які меў на беларускіх землях спецыфічныя рысы развіцця. У якасці адной з галоўных такіх рыс выступае актыўны працэс нацыянальнага самавызначэння беларусаў. Фарміраванне беларускай народнасці абапіралася на ўсведамленне роднасці і адзінства (рэлігійнага, тэрытарыяльнага, моўнага і г. д.), было падтрымана грамадска-палітычнымі працэсамі ўтварэння ВКЛ. Такая кансалідацыя шмат у чым садзейнічала не толькі станаўленню беларусаў як самастойнага этнасу, але і спрыяла росту самасвядомасці як найважнейшага імпульсу для развіцця грамадзянска-патрыятычнага накірунку выхавання маладых пакаленняў.

Сярод шэрагу фактараў развіцця грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў XIV – XVII стст. мэтазгодна вылучыць групу рэлігійных фактараў, якія з'явіліся важным аспектам развіцця выхавання грамадзянскаці і патрыятызму.

Рэлігія для перыяду Сярэднявечча выступала вызначальным фактарам грамадскага, культурнага і духоўнага жыцця. Ліхачоў Д. С. у якасці найважнейшай яе функцыі адзначаў "цывілізуючы" уплыў на жыццё чалавецтва [6, с. 43]. Для ўсходнеславянскіх, а разам з імі і беларускіх зямель, распаўсюджванне агульнага веравучэння з'явілася

МГПУ им. И.П.Шамякина

асновай светапогляду і культуры, крыніцай развіцця этыка-маральных нормаў агульнага жыцця, важным сродкам духоўнага аб’яднання людзей.

Замацаванне хрысціянскай філасофіі, па меркаванні Вішнеўскага М.І., насіла не толькі важнае “агульнасветапогляднае, але і педагагічнае значэнне” [1, с. 76]. Яно абумовіла “першаснасць духоўнага ў адносінах да матэрыяльнага, высокія маральныя імператывы, служэнне дабру і праўдзе”, садзейнічала развіццю чалавекалюбства і справядлівасці, маральнаму напаўненню катэгорый “адказнасці”, “адданасці”, “служэння” сваму народу і краіне, якія насілі яскравы патрыятычны характар.

У XIV–XVII стст. канфесійная сітуацыя на беларускіх землях не была адназначнай. Так XIV–XV стст. у ВКЛ вызначаліся пэўным парытэтам паміж праваслаўем і каталіцтвам.

Праваслаўныя каштоўнасці сабornasці, дабрачыннасці і самаахвярнасці дзеля бліжняга вызначылі разуменне “патрыятызму як маральнага абавязаку хрысціяніна” [7, с. 43]. «Если же кто о своих, и особенно о домашних, не печется, тот отрекся от веры и хуже неверного”, – падкрэслівала Святое пісанне (1 Тим.5:8).

Каталіцтва, у аснове вучэння якога тэакратычная сістэма “адзінства”, абапіралася на меркаванне, што “церковь светая въ единости верных залежить, яко и тело въ единости члонковъ” [5, с. 53]. Па гэтай прычыне трываласць царкоўнай іерархііі, і адпаведная ёй грамадская іерархія, павінны насіць “наддзяржаўны і наднацыянальны характар”, стаць падмуркам патрыятызму як “любові да сваёй зямной Айчыны і адданасці ёй”[5, с. 57].

Побач з гэтым важнае месца ў сістэме светаўспрымання беларускага насельніцтва па-ранейшаму належала міфалагічна-язычніцкаму кампаненту, асабліва ў сялянскім асяроддзі. Мноству абрадаў і традыцый, што рэгламентавалі паўсядзенна-бытавую сферу, былі ўласцівы вера ў звышнатуральнае і магічнае, імкненне суадносіць свае дзеянні і ўчынкі з “дзедаўскімі” ўяўленнямі аб асобе і характары яе жыццядзейнасці. Паколькі традыцыйнасць для беларусаў – як адмысловая форма пераемнасці, на думку Шамякінай Т. І., насіла ярка выражаны патрыятычны характар, была накіравана на “захаванне нябачнай сувязі пакаленняў”, як важнай умовы трывалага развіцця народу і краіны [9, с. 238]. Для беларускага селяніна традыцыі моцнай ўзаемасувязі з родам, продкамі, сям’ёй выступалі крыніцай асобаснага самаўдасканалення ў рэчышчы ідэй калектыўнага дабра і прынясення карысці.

З XVI ст. на беларускіх землях назіраецца распаўсюджванне пратэстанцкіх вучэнняў. З’явіўшыся шырокамаштабным пераўтваральным рухам, Рэфармацыя не толькі “наблізіла людзей да Бога”, але і шмат у чым садзейнічала актывізацыі асобаснай пазіцыі чалавека ў адносінах да сябе, свайго народу, краіны [8, с. 54]. Яшчэ Францыск Скарына, якога



МГПУ им. И.П.Шамякина

называюць "папярэднікам беларускага рэфармацыйнага руху", адзначаў важнасць таго, што "…людзі, да таго месца, дзе яны нарадзіліся і ўзраслі ў Богу, вялікую любоў маюць" [3, с. 27]. Увасабленнем такой любові ў яе дзейсных формах, прыкладам адданасці інтарэсам Радзімы становіцца дзейнасць гуманістаў і рэфарматараў Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Андрэя Волана, Мікалая Радзівіла Чорнага, якія "і словам, і справай" даказвалі сваю вернасць Айчыне.

Прапаведніцка-місіянерская дзейнасць езуітаў у рамках Контррэфармацыі характарызаваліся на беларускіх землях дабрачыннасцю і асветніцтвам, садзейнічала актывізацыі кнігадрукавання, адкрыцця сеткі адукацыйных установ, што мела важнае значэнне для развіцця навучальна-выхаваўчай справы на Беларусі. Аднак прыхільнасць прадстаўнікоў "Таварыства Ісуса" да тэакратычнага адзінства рабіла немагчымым выпрацоўку кампрамісных пагадненняў з прадстаўнікамі іншых веравызнанняў, што было важнай умовай стабільнасці ў поліканфесіянальным грамадстве ВКЛ.

Раўнавага паміж гэтай рэлігійнай разнастайнасцю трымалася за кошт лаяльнай агульнадзяржаўнай палітыкі і традыцыйна ліберальнага стаўлення да прадстаўнікоў іншых народнасцей і рэлігій, што былі вядомы на беларускіх землях з даўніх часоў. Такая талерантная скіраванасць грамадскіх адносін побач з прыярытэтам дзяржаўна-палітычнай цэласнасці садзейнічала падтрымцы гуманістычнага характару грамадзянска-патрыятычных настрояў, іх арыентацыі на калектыўныя інтарэсы дзеля захавання міру і грамадскага парадку. Паколькі незалежна ад канфессійнай прыналежнасці грамадская большасць прызнавала "згоду, заснаваную на добрай волі" [5, с. 44].

Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г., з'явіўшыся спробай вырашэння рэлігійнага пытання ў ВКЛ, абвастрыла канфесіянальныя супярэчнасці, прывяла да маштабнай палемікі ў грамадстве. Прадстаўнікі розных веравызнанняў па-рознаму ставіліся да шэрагу нацыянальна-патрыятычных пытанняў, неаднолькава інтэрпрэтавалі паняцці "грамадскага служэння" і "згоды", "агульнага дабра" і "нацыянальна-культурных каштоўнасцяў". Аднак іх дыскусія абумовіла актывізацыю грамадзянска-патрыятычных тэндэнцый грамадска-педагагічнай думкі Беларусі XVI–XVII стст., аказала ўплыў на далейшае развіццё асветніцкага характару і прыярытэт нацыянальна-каштоўнасных вектараў патрыятычнага выхавання.

Такім чынам, галоўнай характарыстыкай рэлігійнай сітуацыі перыяду XV–XVI стст. з'яўляецца так званы рэлігійны плюралізм. Ён стаў пошукам кампрамісу паміж рознымі плынямі і накірункамі, якія з'явіліся адлюстраваннем неаднароднага этнарэлігійнага складу насельніцтва ВКЛ. Гэта прывяло да запатрабаванасці цярпімасці, заснаванай на ўзаемапавазе, не толькі ў якасці важнай палітычнай заваёвы полікультурнага грамадства,

МГПУ им. И.П.Шамякина

але і як спосабу вырашэння разнастайных пытанняў, і дзейснага сродку выхавання грамадзянска-патрыятычных якасцей. Побач з ростам нацыянальнай свядомасці адбываецца перапляценне доўгу рэлігійнага, які абапіраецца на мараль, і доўгу грамадзянскага, што меў прававую састаўляючую. І калі першы быў запатрабаваны яшчэ з часоў Кіеўскай Русі, то другі стаў лагічным працягам развіцця дзяржаўна-прававых інстытутаў, сферы права і абавязкаў даследуемага перыяду.

Аднак умовы царкоўнай ўніі, дзяржаўная падтрымка каталіцтва, актывізацыя езуіцкага ўплыву – парушылі рэлігійны "баланс", што прывяло да страты канфесійнага кампрамісу, парушэння закладзеных у XVI ст. асноў верацярпімасці і скіраванасці на агульнае дабро. На працягу XVII ст. адбываецца пэўны ідэалагічны раскол грамадства па рэлігійнай прыкмеце. У такіх умовах патрыятычным лічылася захаванне прыхільнасці "ўласнай праваслаўнай веры" і традыцыям. Кутузава Н.А. адзначае, што к XVII ст. у ВКЛ "барацьба за свабоду веравызнання стала сінонімам барацьбы за нацыянальную незалежнасць" [5, с. 8].

Значных поспехаў у справе "захавання нацыянальна-рэлігійнай самабытнасці" дасягнула дзейнасць праваслаўных брацтваў, якія ўзначалілі патрыятычнае супрацьстаянне каталіцка-езуіцкай палітыцы на беларускіх землях [4, с. 67]. Крыштаповіч Л. зазначае, што яны ўяўлялі сабой "нацыянальна-рэлігійныя саюзы праваслаўнага насельніцтва", якія выступалі абаронцамі не толькі веры, але і "тутэйшага народа" [4, с. 83]. Аб'яднаўшы "людзей народу Рускага і закону Грэчаскага", такія брацтвы імкнуліся да захавання гістарычных каштоўнасцяў, што грунтаваліся на "праваслаўным светаўспрыманні", для якога былі характэрны калектыўна-патрыятычныя настроі адзінства, калегіяльнасці, традыцыйнасці [4, с. 48].

К канцу XVII ст. ў ВКЛ перавагу атрымае каталіцтва, аднак рэлігійны плюралізм XV–XVI стст. значна паўплываў на развіццё грамадзянска-патрыятычных пачуццяў беларусаў, іх арыентаванасць на агульнае дабро і ўзаемапавагу. Побач з пашырэннем асветы і кнігадрукавання галоўным дасягненнем і яскравай дэманстрацыяй перамогі грамадскай згоды было заканадаўчае замацаванне "рэлігійнай "вольнасці", што была зафіксавана ў ІІІ Статуце ВКЛ [3, с. 258]. Гэта спрыяла росту нацыянальнай самасвядомасці, грамадскай адказнасці і згоды прывеліяванай часткі грамадства, як галоўных сродкаў захавання адзінства, стабільнасці і самастойнасці княства, а таксама значных паказчыкаў развіцця змястоўнага напаўнення выхавання патрыятызму і грамадзянскасці.

Такім чынам, рэлігійны фактар выступаў у якасці дэтэрмінанты развіцця грамадзянска-патрыятычнага выхавання на беларускіх землях на працягу XIV – XVII стст., абумовіўшы шмат у чым гуманістычную і этнакультурную накіраванасць зместу выхавання грамадзянскасці і патрыятызму на аснове чалавекалюбства, талерантнасці, згоды і агульнага дабра.



МГПУ им. И.П. Шамякина

## Спіс выкарыстанных крыніц


1. Вишневский, М.И Философский синтез как мировоззренческая основа образования: монография / М.И. Вишневский. – Могилёв: «Изд-во Могилевского гос. ун-та им. А. А. Кулешова», 1999. – 252 с.
2. Гавриловец, К.В. воспитание человечности: книга для учителя / К.В. Гавриловец. – Минск: Народная асвета, 1985. – 183 с.
3. История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение: хрестоматия: пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010. – 332 с.: ил.
4. Криштапович, Л.Е. Православные братства в Беларуси // Беларусь как русская святыня / Л. Е. Криштапович. – Белгород: ИПК НИУ «БелГУ», 2012. – 142 с.
5. Кутузова, Н.А. Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII в. / Н.А. Кутузова. – Минск,1998. – 93 с.
6. Лихачев, Д.С. Человек в литературе древней Руси / Д.С. Лихачев. – М.: “Наука”, 1970. – 180 с.
7. Священник Протасов, С. Христианство и патриотизм / Священник С. Протасов // Православное слово. – 2014. – № 5 (май). – С. 43–44.
8. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII в.). / В.В. Старостенко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2001. – 200 с.
9. Шамякіна, Т. І. Міфалогія Беларусі (нарысы). / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 400 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина